

Уладзімір Даўгяла. Партрэт Францыска Скарыны. 2022

# Францыск Скарына: шмат моў, несупыннае перамяшчэнне і адсутнасць праблем з самаацэнкай

## Francysk Skaryna: many languages, constant movement and no self-esteem deficit

**A discussion on the relevance of Francysk Skaryna's legacy to our time was held at the 30th anniversary celebration of the European Humanities University in October 2022. Skaryna's "Little Travel Book" was released in Vilnius 500 years ago and was an educational, cultural, and entrepreneurial project ahead of its time, inspiring generations of not only Belarusians but all Central European cultural actors. The discussion, which included EHU faculty and renowned Belarusian researchers Aliaksandr Hrusha, Siarhei Chareuski and Aliaksandr Kalbaska, explored Skaryna's life and work as a source of answers to contemporary challenges.**

У Вільні, у шыкоўнай залі адноўленага Палаца Вялікіх Князёў Літоўскіх, 6–7 кастрычніка 2022 года адбылася канферэнцыя, прысвечаная трыццацігоддзю Еўрапейскага Гуманітарнага Ўніверсітэта. Удзельнікі разважалі пра місію ўніверсітэта, ліберальную адукацыю ды сучасныя гуманітарныя выклікі для Беларусі. Кантэкст падзеі вызначаўся таксама пяцісотгоддзем першага Віленскага выдання Францыскам Скарынай Малой падарожнай кніжыцы. Асобе Скарыны – інтэлектуала, асветніка і падарожніка, які не толькі запачаткаваў беларускае кнігавыданне, але і з'яўляўся заўважным дзеячом Цэнтральнаеўрапейскага рэгіёна, была прысвечана адна з найцікавейшых канферэнцыйных дыскусій з удзелам гісторыкаў Аляксандра Грушы, Аляксандра Калбаскі і Сяргея Харэўскага. Змяшчаем тут яе ключавыя фрагменты.

**Аляксандр Калбаска** Калегі, давайце паспрабуем праз прызму Скарыны ўглядзецца і ў сябе, і ў ЕГУ, і ў студэнтаў, якіх мы рыхтуем ужо 30 гадоў запар. Заснавальнік нашага ўніверсітэта акадэмік Анатоль Міхайлаў прыводзіў нядаўна аргументы, згодна якім існаванне ЕГУ было і застаецца амаль немагчымым. Дзейнасць і дасягненні Скарыны таксама могуць падацца неверагоднымі. Але і тое, і другое – было, а ЕГУ існуе дасюль. Хацелася б пачаць з таго, каб акрэсліць гістарычны кантэкст еўрапейскага сярэднявечнага Асветніцтва, прычым зрабіць гэта праз прызму сучаснасці.

**Аляксандр Груша** У першую чаргу хачу павіншаваць з 30-годдзем ЕГУ яго заснавальніка, кіраўніцтва, выкладчыкаў, усіх супрацоўнікаў і студэнтаў! Што да Скарыны… Зададзімся пытаннем: ці можна сказаць пра яго нешта новае? Пра Скарыну ў Беларусі напісана больш, чым пра каго-кольвек. Адкажу: можна! Кіруючыся ўстаноўкай, што пытанні да гісторыі дыктуюцца сучаснасцю, я хацеў бы правесці мост паміж намі і тым часам, калі жыў Скарына.

Скарына прадстаўляе асаблівы тып асобы, які з'яўляцца ў Вялікім Княстве Літоўскім на рубяжы XV і XVI стагоддзяў. Такая асоба робіць свой індывідуальны выбар згодна з унутраным пакліканнем, насуперак існуючым культурным, сацыяльным і сямейным традыцыям.

З усіх асоб гэтага тыпу Скарына – найбольш яркі. Ён быў сынам мешчаніна з Полацка, які згодна з існуючым парадкам павінен быў працягнуць справу бацькі і дзеда ды стаць купцом. Аднак Скарына зрабіў іншы выбар. Ён паступіў ва ўніверсітэт, атрымаў вучоныя званні, прысвяціў сябе перакладу кніг Бібліі – справе, якая была больш уласціва духавенству. Таксама Скарына змяніў рэлігію. Пры нараджэнні ён быў ахрышчаны ў праваслаўе, а пасля дасягнення паўналецця прыняў каталіцтва.

У святле гэтых фактаў Францыск Скарына рызыкаваў стаць аутсайдэрам у тагачасным грамадстве. Але пры гэтым ён меў вельмі высокую самаацэнку, лічыў сябе паслядоўнікам Еранiма Стрыдонскага, які стварыў Вульгату, а таксама Феадатыёна, які пераклаў на грэчаскую мову Стары Запавет. У прадмове да Дзеяў Апосталаў Скарына намякнуў, што свой выбар ён зрабіў на ўзор евангеліста апостала Лукі.

Я доўга шукаў той вобраз, патэрн, які б даў магчымасць зразумець Скарыну. І знайшоў яго там, дзе не чакаў – у працах прадстаўніка гуманістычнай псіхалогіі Абрахама Маслоў, прысвечаных самаактуалізаванай асобе. Такая асоба самазабыўна аддаецца сваёй справе, што з'яўляецца галоўнай умовай яе асабістага росту. Яна схільная да новых ідэй, дабрадзейства, у яе нізкі ўзровень унутранага канфлікта, яна любіць і цэніць жыццё і бачыць прыгажосць свету лепш, чым хто іншы. Прыгажосць для такога чалавека атаесамляецца з дабром, чалавекалюбствам, грамадзянскасцю і патрыятызмам. Яго творчасць грунтуецца на здольнасці супраціўляцца ўплыву культуры і грамадскай думкі. Скарына, на мой погляд, – менавіта такая асоба.

**Сяргей Харэўскі** Я згодны з калегам, і найбольш – у частцы скарынаўскай самаацэнкі: ён жа змясціў у Бібліі свой партрэт! Адзін з нашых калег, выкладчык Люблінскага ўніверсітэта Сяргей Кавалёў прапаноўвае ўявіць, каб сёння нехта параклаў Каран і на першай старонцы змясціў асабісты партрэт з аўтографам.



## Аляксандр Груша

гісторык, доктар гістарычных навук, былы дырэктар Цэнтральнай навуковай біліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, стыпендыят Нямецкага гістарычнага інстытута ў Варшаве.

Сапраўды, калі мы возьмем усе першадрукі, першыя пераклады святога пісьма, то Скарына – адзіны, хто змяшчае ў святых тэкстах аўтапартрэт, ды яшчэ з аўтографам! Канешне, з самацэнкай тут відавочна не было праблем.

Альтэрнатывай для Скарыны было застацца ў Полацку і стаць заможным чалавекам, як пакаленні ягоных продкаў, якія мелі, як сёння сказалі б, «офісы» у Рызе, Познані ды іншых гарадах. Але ён зрабіў іншы выбар і зрабіў сябе сам.

Пры тым, што у Полацку часоў яго юнацтва школаў у сучасным разуменні не было. Толькі-толькі, са з'яўленнем кляштара бернардынцаў, ствараецца першая больш-менш падобная да сучасных школа. Хронікі паведамляюць, што дзейнасць бернардынцаў была настолькі паспяховай, што каталікамі сталі да тысячы палачан. Да нядаўняга часу гэта быў апокрыф, неспраўджаны дакументаль-



**Сяргей Харэўскі**
мастацтвазнаўца,
гісторык архітэктуры,
культуролаг і літаратар,
выкладчык ЕГУ

на. Але археолагі знайшлі ў Полацку месцазнаходжанне гэтага кляштара. Такім чынам, першыя гады існавання бернардынцаў у Полацку – гэта, бадай, адзіная магчымасць для Скарыны навучыцца лацінскай мове. Тады ён прыязджае ў Вільню.

І нават тут, у сталіцы, не асабліва ёсць з чаго выбіраць. Тагачасная «сістэма адукацыі» разлічана на прывілеяваныя саслоўі. Бо, нагадаю, быў росквіт прыгонніцтва, і трапіць у гэтыя школы, аплаціць вучобу, пераезды маглі ну літаральна адзінкі! Нават не ўсе з арыстакратаў, са шляхты маглі сабе дазволіць такую адукацыю. А я падазраю, што і матывацыю мелі не ўсе! Адпаведна, скончыўшы школу ў Вільні, Скарына едзе ў Кракаў, дзе паступае ва ўніверсітэт. Шчыльнасьць інтэлектуальнай прасторы, адукацыйна-інтэлектуальнага асяроддзя імкліва нарастае з Усхода, з адукацыйнай пусткі, якую уяўляў сабою тады Полацак, на Захад.

Ізноў жа, некаторыя рэчы для нас сёння нязвыклыя. Напрыклад, што той, хто абіраў займацца медыцынай, фактычна абавязаны быў вучыць арабскую мову, таму што на той час гэта была ці не адзіная крыніца бясконцых ведаў ў галіне высокай медыцыны, хіміі і батанікі, якой у далейшым Скарына прысвяціў жыццё. Каб перакладаць Святое Пісанне, каб параўноўваць свой пераклад і з Сэптуагінтаю, і з Вульгатаю, ён мусіў валодаць хаця б на пачатковым узроўні іўрытам, сражытнагабрэйскай ды, натуральна, грэцкай мовамі. Як мы разумеем, жывучы ў Кракаве, ён мусіў размаўляць і па-польску. Такім чынам, шмат моў і несупыннае перамяшчэнне!

**Аляксандр Калбаска** Днямі ад прафесара Дэна Дэвідсана прагучала думка, што навуковы і акадэмічны свет 2022 года, калі праходзіць наша канферэнцыя, значна адрозніваецца ад 1992 – года стварэння ЕГУ. Што ўжо казаць, наколькі моцна ён адрозніваецца ад 1522 года, калі ў Вільні выдаецца Малая падарожная кніжка. І ўсё ж, ці нешта лучыць той час з нашым? Як вы лічыце?

**Аляксандр Груша** Лічу, што пэўная пераемнасць праходзіць праз усе гады. Аб якіх саслоўях у Вялікім Княстве Літоўскім мы ведаем? Паны, шляхта-баяры, мяшчане, духавенства... Мне здаецца, Скарына анансаваў з'яўленне яшчэ аднаго саслоўя – вучоных. У прадмове да кнігі Судзей Ізраілевых ён напісаў, што ў складаныя часы бог дасылае пастараў і дактароў, якія вучаць змагацца з «бесовскими покусами». Для рубяжа XV–XVI стагоддзяў мы можам гаварыць яшчэ як мінімум пра двух асоб, падобных да Скарыны. Адзін з іх Мацей Дзясяты – стваральнік Біблейскага зборніка (вядомага па позніх крыніцах і ў літаратуры як Дзесятаглаў), які сучасныя даследчыкі ставяць у адзін шэраг з такімі шэдэўрамі кнігапіснага мастацтва, як Астрамірава евангелле XI стагоддзя або Кіеўскі псалтыр XV стагоддзя. Мацей, з яго слоў, узяўся за працу над гэтым зборнікам, кіруючыся ідэяй, змешчанай у вядомай новазапаветнай прытчы аб талентах. Так ён дэкклараваў выбар свайго занятку. Згадаю таксама аб дзейнасці арыстакрата князя Фёдара Іванавіча Яраславіча – чалавека, што прытрымліваўся нейкіх вышэйшых правілаў, сфармуляваных на аснове хрысціянскіх каштоўнасцяў. Відавочна, існавала цэлая плеяда асоб падобнага тыпу як сярод свецкіх асоб, так і сярод духавенства, прычым даволі ўнушальная і ўплывовая, якую можна аднесці да папярэднікаў сучасных вучоных.

Мы прывыклі бачыць у Скарыне ў першую чаргу перашадрукара. Але ён ніколі не пазіцыянаваў сябе як работніка друкарскага варштата. Ён – доктар у лекарскіх і свабодных навуках, абраны муж, настаўнік... І ён яўна не лічыў сябе самотным, нават і ў Вялікім Княстве Літоўскім.

**Сяргей Харэўскі** Натуральна, Скарына быў перадусім лекарам і з гонарам пісаў пра гэта. Ва ўсе часы існавала група людзей, якія ў сваіх вежах са слановай косткі гулялся ў бісер. Скарына ж – практык!

Нашы эпохі лучаць хутказменныя абставіны, якія прымушаюць нас трансфармавацца, прыстасоўвацца да іх. І толькі багаж ведаў і пэўная кваліфікацыя, пэўныя кампетэнцыі могуць не проста ўтрымаць нас ў гэтым свеце, але і даць нейкі плён.

У тую эпоху, напрыканцы XV – пачатку XVI стагоддзя Еўропа прыйшла ў рух, усё імкліва змянялася. Падзеі апераджалі адна другую. Гэта была эпоха грандыёзных войнаў. У тым ліку ў Чэхіі – Гусіцкіх войнаў. Былі страшэнныя эпідэміі халеры, чумы. Скарына быў, як дарэчы і іншы наш зямляк, Мікола Гусоўскі, сведкам страшнай чумы ў Рыме. Ён вымушаны быў уцякаць з Прагі. І тады, і сёння мы ўсё адно становімся закладнікамі нейкіх пандэмій. А яшчэ – несупынных войн. Нагадаю, што пакуль Скарына друкаваў свае кнігі, ішла так званая шостая Маскоўска-літоўская вайна, у выніку якой быў знішчаны Полацк. Яна доўжылася дзесяць гадоў! А ён друкаваў кнігі. Гэта – таксама пра выбар, які робіць чалавек.

**Аляксандр Калбаска** Дарэчы, як вы думаеце, што б сказаў Францыск Скарына, калі б пачуў, як на папярэдняй дыскусіі наш калега, пісьменнік Віктар Марціновіч шчыра прызнаўся, што падчас вайны пісаць не можа. Маючы на ўвазе палітычны крызіс у Беларусі і вайну ва Ўкраіне, ён нават перафразаваў славуты выраз: «Ці можна пісаць вершы пасля Бучы?» Што б яму адказаў Францыск?

**Аляксандр Груша** Паспрабую выказаць здагадку. У пачатку свайго выступлення я нагадаў, што Скарына зрабіў свой выбар на ўзор евангеліста Лукі. Ведаеце, што ён піша пра яго? Лука спачатку быў доктарам у лекарскіх навуках, «лекарем телесным доскональным», а потым, калі зразумеў, што ўсё матэрыяльнае ў свеце марна, стаў лекарам душ чалавечых і лячыў словам Божым. І глядзіце, наколькі апісанае супадае з выбарам Францыска Скарыны! У Падуі ён атрымаў званне доктара медыцыны. Але неўзабаве выступіў як перакладчык і выдавец біблейскіх кніг – Божага слова. Са Скарынам адбылося тое ж, што і з Лукой. З дапамогай гэтай паралелі Скарына перадаў розныя ідэі, у тым ліку аб важнасці захаванні ўласнай індывідуальнасці, незалежна ад абставін. Я лічу, што гэтае захаванне, нават у самых складаных і бязлітасных умовах, з'яўляецца адной з самых магутных апораў існавання чалавечай асобы і ўсяго грамадства.

**Сяргей Харэўскі** Віктар Марціновіч – творца, ад якога чытачы вымагаюць адказаў на галоўныя пытанні нашага часу. А я, канешне, яму б запярэчыў. Скарына ўсё жыццё жыў ва ўмовах вайны. Ягоны Полацк пры жыцці быў знішчаны дазвання. Ён стаў сведкам гран-

дыёзных эпідэмій і войнаў у Еўропе. Мірных часоў у нашым сэнсе ён проста не ведаў. Тады ніхто не меў шчасця бачыць дзесяцігоддзі міра. Але ў людзей яго эпохі быў троху іншы гарызонт. Мы сёння хочам, каб усё было належным чынам ужо пры нашым жыцці. Тыя ж людзі мыслілі далёка-далёка наперад.

Я не думаю, што ён быў настолькі рамантыкам, усё ж прафесія лекара вельмі прыкладная. Ды й лячыў Скарына не абы каго: сярод яго пацыентаў было некалькі манархаў, якія за яго спрачаліся. Як і большасць тытанаў Адраджэння, ён быў вельмі практычны і прагматычны, ведаў кошт матэрыяльнаму свету. Я не думаю, што ён спадзяваўся, што гэтыя кніжкі тут жа дадуць прыбытак або расцякуцца па краіне і весь народ адразу стане асветленым. Таму ўсё роўна такія людзі глядзелі наперад на пакаленні.

**Аляксандр Калбаска** Я хацеў бы яшчэ закрануць тэму патрыятызма за межамі Радзімы. Тады і цяпер. Наколькі мелі рацыю крытыкі ЕГУ, калі жорстка папракалі, а бывае, што і працягваюць папракаць наш універсітэт за «вымыванне мазгоў» з Беларусі?

**Аляксандр Груша** Звернем увагу, што асноўны масіў кніг Скарына выдаў менавіта за межамі Вялікага Княства. Не на радзіме, а ў Празе, прычым пражскія выданні больш багатыя і свабодныя ў мастацкім выкананні. Нам невядомыя ўсе абставіны выдання віленскіх кніг, але здаецца, у Вялікім Княстве Скарына не мог рэалізаваць усе свае творчыя задумы. Ці сведчыць гэта аб тым, што ён не быў патрыётам? Безумоўна – не. Проста тыя ўмовы і абставіны, у якіх Скарына аказаўся на радзіме, у тым ліку тэхналагічныя, не спрыялі поўнай рэалізацыі яго задум.

Ён сапраўды быў асветнікам, і гэта не метафара. Выдадзеныя ім кнігі былі разлічаны на русінаў, як называлі тады беларусаў і украінцаў. Але строга кажучы, мэтай яго дзейнасці было ўшанаванне бога. Бо калі народ створаны богам, то служэнне народу ёсць служэнне богу. Так у катэгорыях свайго часу мысліў Скарына. І ў гэтым служэнні было важна не тое, дзе геаграфічна адбывалася яго дзейнасць, а дзе ён мог больш за ўсё ў ёй рэалізавацца, а значыць і больш паслужыць свайму народу.

**Аляксандр Калбаска** Дык чаму ж ён не вяртаўся ў Полацк?

**Сяргей Харэўскі** На маю думку таго, колішняга, Полацка яго дзіцячых гадоў, ужо не існавала. Пасля трох войнаў горад быў у занядзе, у ім стаяла маскоўскае войска. Месца Скарыне там не было проста па вызначэнні. Разам з тым, «так і людзі, дзе ўскормлены былі, да таго места вялікую ласку маюць». Прыгажэй, чым у прадмове Скарыны, пра любоў да Радзімы не скажаш.



## Аляксандр Калбаска

музеолаг, кандыдат гістарычных навук, прафесар ЕГУ, былы дырэктар гісторыка-культурнага запаведніка «Заслаўе» (Беларусь), заснавальнік і першы кіраўнік Беларускага камітэта ICOM.

Мы заўсёды ўяўляем сабе Скарыну згодна з вобразам, створаным беларускімі мастакамі. Маўляў, ён і піша пяром, і рэжа паперу, і прэс сам цісне. Ён і мастак, і перакладчык. Канешне, гэта трохі наіўнае ўяўленне. За пару гадоў да таго, як ён пачаў друкаваць у Вільні кнігі, тут стварылі паперню. Гэта быў цывілізацыйны скачок, які можна параўнаць з вынаходніцтвам пластыка ў іншыя часы!

Бо што такое тады была папера? Не было раней такога матэрыялу. Мы ведаем, што калі капнем каваю ці слязінкай на аркуш сучаснай паперы – яна ўздыбіцца. А тагачасны аркуш паперы павінен быў прайсці праз станок, высахнуць. Быць перагорнуты на другі бок, высахнуць яшчэ раз. Дадаем чырвоны колер, і яшчэ раз! І так – чатыры разы праз станок і чатыры разы – высахнуць і не скурчыцца. Пару гадоў ішла адладка тэхналогіі, запрашаліся замежныя спецыялісты, натуральна – немцы. Пасля ён прывозіў з Кёнігсбергу друкароў, працавала брыгада мастакоў, рэзчыкаў. А яшчэ майстэрства вырабу пераплётаў. Канешне гэта тэхналагічны скачок!

Скарына ніколі не быў адзін, як многія ўяўляюць. У яго быў сябра – біскуп Ян з літоўскіх князёў, які яму ўсяляк спрыяў. Ідэя выдаваць кнігі на мове, зразумелай тутэйшым людзям, была таксама яго ідэяй. Відавочна, гэта тады насілася ў паветры. Таму яго спансіравалі гэтаксама, як сёння ставяць у журналы рэкламныя блокі. Той жа бурмістр Якуб Бабіч даў яму свой дом. А яшчэ ж і пераклад займаў час ды патрабаваў рэсурсаў. То бок Скарына зусім не выглядае такім дзіваком, каторы недзе там – «маленькі Францішак за печкаю, са свечкаю». Не, гэта каласальная работа цэлай карпарацыі ці кампаніі, таксама як і наш універсітэт. Менавіта яна дала нам кнігу. Ну а «менэджэрам» быў Францыск Скарына.

**Аляксандр Калбаска** Гэта ўсё выдатна, але Вы ўхіліліся ад другой часткі пытання. ЕГУ ў выгнанні – не беларускі ўніверсітэт?

**Сяргей Харэўскі** Ён цалкам беларускі. Як кнігі Скарыны былі прызначаны для «люду паспалітага, языка руського», так і сёння наш універсітэт дае веды, гартуе кадры, захоўвае інтэлектуальнае асяроддзе на перспектыву. Натуральна, для будучыні люду беларускага.

**Аляксандр Калбаска** А ці можна назваць Скарыну і студэнтаў ЕГУ валацугамі, альбо гэта ўсё ж такі шукальнікі магчымасцяў для самарэалізацыі?

**Сяргей Харэўскі** Можна пагадзіцца з такой назвай, а можна і не пагадзіцца. У Скарыны то й выбара асабівага не было. З'ехаў з Вільні, бо быў вялікі Віленскі пажар. Загінула жонка. Згарэў дом. Аб'ектыўна трэба было кудысьці перамясціцца. У Празе пачаліся вайна і чума. Ён бы вярнуўся, напэўна, у Полацк, каб той не быў таксама знішчаны. Можа быць, каб яго запрасілі ў Парыж, ён бы і туды паехаў. Гэта не проста летуценні – паехаць пажыць у Падую, ля мора. Гэта прагматычы, аб'ектыўны выбар. Тым больш, што падарожжы ў тую эпоху былі неад'емным складнікам вучобы. Студэнты пераходзілі з універстэта ва ўніверсітэт, вучылі мовы, слухалі розных прафесароў...

**Аляксандр Груша** Я не лічу, што Скарына быў валацугай. Трэба разумець мысленне чалавека ў Сярэднявеччы. Існавала ўяўленне, што чым больш краін ты аб'ехаў, тым большымі ведамі валодаеш. Набыццё замежнай практыкі з'яўляецца нормай і для сучаснага даследчыка.

**Сяргей Харэўскі** Я падтрымаю спадара Аляксандра. Сапраўды, узровень ведаў Скарыны заварожвае. Яго самі манархі запрашалі!

Мяне асабіста цікавіць стварэне ім Каралеўскага батанічнага сада ў Празе. То бок, чалавек, які быў ужо ў маім веку, яшчэ недзе вучыўся садоўніцтву. Можна ўявіць, што як доктар ён ведаў лекавыя якасці некаторых раслін. Але ж адкуль ён ведаў, з якой хуткасцю яны растуць, якая ім трэба тэмпература, які стварыць мікраклімат, колькі трэба вады? І ўсё ж ён вызначае, колькі ды чаго будзе пасаджана. Імператар Максіміліян зацвярджае праект, згодна якому змяняецца гідралогія, зносяцца будынкі, высякаюцца дрэвы, робяцца спецыяльныя падпорныя сценкі, замаўляецца насенне і гэтак далей. Як ні круці, гэта амаль фантастычна. Чалавек бярэцца, пражыўшы паўвека, стварыць каралеўскі сад, і мы нідзе не можам знайсці сведчання таго, што ён раней гэтым займаўся... Гэта таямніца заварожвае. А праз тры гады – калі ласка: сад расце, значна паўночней натуральнага арэала квітнеюць цытрусавыя, алівы, фінікі, інжыр і так далей. Імператар задаволены. Вось яскравая ілюстрацыя, якіх ведаў чалавек дасягнуў толькі падарожжамі.

**Аляксандр Груша** Гэта адпавядае тыпу самаактуалізаванай асобы паводле Абрахама Маслоў – схільнасць да новых ідэй і наватарства. І, дарэчы, калі не памыляюся, батанічны сад, створаны Скарынам у Празе, быў другім у Еўропе.

**Сяргей Харэўскі** І да сёння ёсць! Растуць тыя самыя лімончыкі!

**Аляксандр Калбаска** Як і студэнты ЕГУ, Скарына атрымаў ліберальную адукацыю, каб потым прыстасоўваць сябе да любой сферы. Давучваючыся, здабываючы новыя веды, ён намагаўся быць першым. Мы імкнемся рабіць прыкладна тое самае: даем студэнтам шырокую адукацыю, каб яны маглі самі нават стварыць сваё першае працоўнае месца, не абаязкова па дысцыпліне, запісанай у дыпломе. Так што вучымся гэтак жа, як Скарына пяцьсот гадоў таму.

**Сяргей Харэўскі** Я ўжо казаў, людзі той эпохі былі прагматычнымі. Мы часта пра гэта забываем. Калі ты будуеш палац ці выдаеш кніжкі – гэта ў любым разе грошы. На маё перакананне, нехта яго на гэта інспіраваў. Мяркую, што гэта быў ці то сам біскуп Ян, ці то было нейкае кола людзей, якія даручылі Скарыне здзейсніць гэты праект. Натуральна, Скарына моцна вылучаўся ўзроўнем адукацыі. Скажам, ніхто з Медзічы не быў такі адукаваны. Скарына паставіў на навуку, на адукацыю. Ягонае імя стаіць трошку паасобку. Гэта не ў чыстым выглядзе прадпрымальніцтва. Ён быў некім медыюмам, ён пераносіў ідэі. Знаёміў суайчыннікаў з цывілізацыйнымі здабыткамі, з батанікай, са знаходкамі медыцыны. Праз яго нешта прамаўляла!

**Аляксандр Калбаска** Так, гэта пра асветніцтва і адукацыйны ландшафт, але гэта яшчэ і пра прадпрымальніцтва, пра тое, якія прадрымальніцкія здольнасці ён мог выкарыстоўваць для дасягнення канкрэтных асветніцкіх мэтаў. Падсумоўваючы, хачу шчыра падзякаваць калегам, якія вельмі якасна, вынаходліва адказвалі на часам правакацыйныя пытанні. Сёння паміж ЕГУ і эпохай Скарыны мы знайшлі не адзін, а можа з паўтузіна масточкаў. Важна прымерыць эпоху і вобраз Скарыны на сябе, каб рабіць выбар у адпаведнасці з пакліканнем, далучацца да саслоўя вучоных і асветнікаў і ўрэшце захаваць сябе. Усё гэта ўжо не адзін дзесятак гадоў актуальна для студэнтаў нашага ўніверсітэта.

Два гады таму мы ў ЕГУ распачалі працу па стварэнні культурнага маршрута «Еўрапейскія культурныя шляхі Скарыны». Ёсць ужо два адпрацаваныя этапы: ад Полацка да Вільні і ад Вільні да Кракава. Калі будуць рэсурсы, у наступным годзе мы дабярэмся з Кракава да Прагі. А потым – з Прагі да Падуі. Гэта дазволіць (можа не нам, а нашчадкам, калі Беларусь стане нармальнай краінай з мяжой, якую лёгка прайсці турыстам) афіцыйна зарэгістраваць гэты маршрут, далучыць яго да ўжо існуючых зараз 48-мі культурных маршрутаў, якія злучаюць розныя гарады і краіны Еўропы – ад маршрута д’Артаньяна да маршрута ў Санц’яга дэ Кампастэла. У гэта мы верым і працуем на гэта няспынна.

Дзякуй усім удзельнікам дыскусіі!